Библиотека Международного Мемориала

# ГАЛАСУЮ ЗА БЕЛАРУСЬ!

## ВЫБАРЧАЯ ПЛАТФОРМА БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ ЗА ПЕРАБУДОВУ «АДРАДЖЭНЬНЕ» ДА ВЫБАРАЎ 1990 ГОДА



Шмат працы і крыві аддаў наш народ, каб адстаяць сваю незалежнасць і пабудаваць жыцьцё вартае свабоднага чалавека. Але сёньня, праз 72 гады непадзельнай улады наменклатурнай партбюракратыі, мы фактычна стаім перад зглумленым храмам: наша зямля забруджана радыёнуклідамі ды нітратамі, паветра атручана выкідамі прамысловых прадпрыемстваў, а вада сьцёкамі з хворых палёў і жывёлагадоўчых фермаў. Ніякія намаганьні не даюць плёну. Нашая сістэма прамысловасьці не можа наладзіць выпуску тавараў, якія б знаходзіліся на ўзроўні міжнародных патрабаваньняў, і што б не радзіла нашая зямля — на прылаўках магазінаў бракуе дастатковай колькасьці прадуктаў.

Мы не здабылі не толькі дабрабыту, мы не здабылі і незалежнасьці. Сёньня мы павінны прасіць у Масквы тое, што належыць нам на праву. Чарнобыльская катастрофа бязьлітасна высьветліла наш сапраўдны стан у Саюзе — стан паўкалоніі, якая пастаўляе цэнтру сельскагаспадарчыя прадукты і тавары прамысловасьці, а самі мы павінны пакорліва чакаць, пакуль гэты цэнтр згодзіцца выдзеліць нам дапамогу у Чарнобыльскім горы.

Далей трываць нельга. Мы не перажывём яшчэ пяць гадоў такога парадку і такога кіраўніцтва. Пасьля Чарнобыля духоўнага, што разбурыў нашу культуру ў часы сталіншчыны, пасьля Чарнобыля радыяцыйнага, які паставіў кропку ў гісторыі "разьвітага сацыялізму", над нашым народам навісла пагроза страшэннай катастрофы — развалу народнай гаспадаркі, выбуху злачынстваў, голаду і пакутаў.

Беларускі Народны Фронт ідзе да выбараў з ідэямі палітычнага і эканамічнага плюралізму, культурнага адраджэньня, з ідэямі дэмакратыі, свабоды і суверэнітэту Беларусі. Мы заклікаем усіх жыхароў Рэспублікі галасаваць за сумленных, кампетэнтных, адказных, дэмакратычна настроеных людзей і адмовіць у сваёй падтрымцы прадстўнікам наменклатуры, іхнім стаўленьнікам і паслугачам, якія страцілі не толькі права на ўладу, але і на проста чалавечы давер.

Лёс грамадства павінен вызначацца самім народам. Ад яго выбару залежыць будучыня Беларусі.

* * *

Выбарчая платформа БНФ "Адраджэньне" грунтуецца на прынцыпах: зямля і заводы — тым, хто на іх працуе, улада Саветам — тым, хто адстойвае інтарэсы народу, аддае яму свае веды і працу.

1. Нельга далей мірыцца з тым, што партыйная і ведамасная бюракратыя валодае манаполіяй на ўладу і ідэалогію, паразітуе на працы грамадства і эксплуатуе яго.

Ніводная з праблемаў сёньняшняга дня ня можа быць станоўча вырашана, пакуль народ ня стане поўным гаспадаром над сродкамі вытворчасьці, над сваёй працай і яе плёнам, пакуль не будзе сам кіравацца сваёй воляй, розумам і сумленьнем. **БНФ адстойвае ідэі незалежнасьці, рэальнага суверэнітэту Беларусі,** бачыць у гэтым найважнейшую палітычную мэту, што стаіць перад грамадствам. Важнейшай задачай БНФ зьяўляецца падрыхтоўка ўмоў да свабоднага выбару народам сваёй самастойнай палітычнай і сацыяльнай перспектывы.

Дзеля гэтага трэба юрыдычна сьцьвердзіць **вяршэнства законаў Беларусі на яе тэрыторыі** над саюзнымі законамі і адпаведнасьць іх падпісаным Рэспублікай міжнародным пактам.

Неабходна юрыдычна замацаваць уласнасьць беларускага народа на сваю зямлю і на ўсе прыродныя рэсурсы Рэспублікі.

БНФ выступае за **поўную гаспадарча-эканамічную самастойнасьць Беларусі,** за перадачу ёй усіх вытворчых фондаў на яе тэрыторыі, за стварэньне свабоднага рынку, за інтэграцыю Рэспублікі ў еўрапейскую і сусьветную эканамічную структуру.

2. Неабходна прыняць **закон пра ўласнасьць** і прызнаць існаваньне і раўнапраўнасьць розных формаў уласнасьці — калектыўнай, дзяржаўнай, прыватнай, кааператыўнай і інш.

Паводле гэтага закону асноўныя фонды прадпрыемстваў па жаданьні працоўных могуць пераходзіць ва ўласнасьць калектываў ці асобных людзей.

3. Прыняць **закон пра зямлю,** паводле якога сяляне павінны мець права пераўтвараць калгасы і саўгасы ў кааператыўныя гаспадаркі; выходзіць з калгасаў і саўгасаў сь зямлёй, якая перадаецца ім мясцовымі органамі ўлады ў прыватную ўласнасьць без усялякага выкупу; ствараць індывідуальныя ці кааператыўныя фермы; выдзяляцца ў хутары; набываць сродкі вытворчасьці на роўных умовах зь іншымі землекарыстальнікамі.

Дзяржава рэгулюе зямельныя адносіны эканамічнымі метадамі.

4. На Беларусі груба парушаецца сацыяльная справядлівасьць. Існуе цэлая сістэма сацыяльных прывілеяў для партыйна-бюракратычных функцыянераў і іхніх сем"яў. Акрамя таго, з кастрычніка 1989 года на 65—100 процэнтаў падвышана зарплата ўсім наменклатурным чыноўнікам, у той час калі сотні тысячаў людзей у Беларусі жывуць па-за рысай беднасьці.

БНФ выступае **за скасаваньне сістэмы партыйна-бюракратычнай наменклатуры,** за перадачу ўсіх яе медыцынскіх, санаторна-курортных, бытавых сьпецустановаў дзецям і пацярпелым ад Чарнобыльскай катастрофы.

БНФ патрабуе **рассакрэціць структуру бюджэту** ўсіх грамадска-палітычных арганізацыяў, у тым ліку КПСС, расшыфраваць крыніцы ўтварэньня іхніх даходаў і выдаткаў.

5. На Беларусі не хапае элементарных тавараў першай неабходнасьці, медыкаментаў. Становішча не паляпшаецца, нягледзячы на рупную працу нашых людзей. На перыяд карэнных палітычных і эканамічных рэформаў неабходна даць сацыяльныя гарантыі для найменш забясьпечаных слаёў насельніцтва. Неабходна:

— забясьпечыць паэтапна права маці мець **трохгадовы аплочаны адпачынак для догляду дзіцяці;**

— стварыць **сістэму прафілактыкі і рэабілітацыі насельніцтва Рэспублікі ад узьдзеяньня радыяцыі;**

— забясьпечыць **мінімальны пражыцьцёвы ўзровень** малааплочваным катэгорыям насельніцтва, пенсіянерам, інвалідам і інш. Мінімальная заработная плата павінна перавышаць мінімальны пражыцьцёвы узровень;

— стварыць дзяржаўную **сістэму перападрыхтоўкі сьпецыялістаў,** што вызваляцца ў выніку пераутварэньня структуры і характару гаспадаркі.

6. Чарнобыльская катастрофа — трагедыя беларускага народу. Выратаваньне насельніцтва Рэспублікі ад радыяцыі зьяўляецца **агульнанацыянальнай задачай.**

БНФ выступае за **неадкладнае адсяленьне жыхароў забруджаных раёнаў** і прыняцьце закона пра сацыяльныя правы людзей, пацярпелых ад Чарнобыльскай катастрофы.

БНФ адмаўляе ненавуковую антычалавечую канцэпцыю "35 бэраў за жыцьцё" і падтрымлівае канцэпцыю беларускіх вучоных, згодна зь якой людзям нельга жыць там, дзе немагчыма атрымаць чыстую сельскагаспадарчую і іншую прадукцыю. У сувязі з гэтым БНФ патрабуе перагляду ўсіх прынятых пастановаў і самога падыходу да пераадоленьня вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Чыноўнікі партыйнага апарату, кіраўніцтва БССР і СССР больш як тры гады ўтойвалі ад насельніцтва Беларусі і ўсяго сьвету вынікі Чарнобыльскай катастрофы і сапраўдныя памеры небясьпекі, чым ненесьлі непапраўную шкоду здароўю людзей. БНФ расцэньвае гэта як **злачынства супроць чалавецтва** і патрабуе прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці кіруючых асобаў, вінаватых у злачынным засакрэчваньні і сьвядомым скажэньні інфармацыі.

БНФ патрабуе ад уладаў СССР **безумоўнай і тэрміновай кампенсацыі** Беларусі, а таксама яе грамадзянам, стратаў, зьвязаных з пераадоленьнем вынікаў Чарнабыльскай катастрофы.

БНФ лічыць, што Урад БССР павінен зьвярнуцца да ўрадаў краін усяго сьвету з просьбай аб дапамозе ў выратаваньні людзей ад Чарнобыльскай радыяцыі.

БНФ **за мараторый на будаўніцтва АЭС у Рэспубліцы, за абвяшчэньне Беларусі бязьядзернай зонай.**

7. За дзесяцігодзьдзі бескантрольнага гаспадараньня на Беларусі загадна-адміністрацыйнай сістэмы катастрафічна пагоршыўся экалагічны стан асяродзьдзя, што пагражае здароўю і жыцьцю людзей. Псуецца беларуская прырода, раскрадаюцца багацьці яе нетраў, зьнішчаюцца краявіды.

Галоўнай умовай нармалізацыі экалагічных абставінаў у Рэспубліцы БНФ лічыць **пераарыентацыю народнай гаспадаркі з энерга- і рэсурсаёмістых** на экалагічна чыстыя і навуковаёмістыя вытворчасьці.

Неабходна ўвесьці аплату за карыстаньне прыроднымі рэсурсамі, заканадаўча зацьвердзіць міжнародна прызнаныя нарматывы чысьціні асяродзьдзя і прадуктаў. Узмацніць адміністрацыйную і крымінальную адказнасьць за іх парушэньне.

Экалагічна небясьпечныя народна-гаспадарчыя і вайсковыя аб"екты (заводы БВК, прадпрыемствы хімічнай прамысловасьці ў Магілёве, Наваполацку, Гародні і іншых гарадах, гіганцкія жывёлагадоўчыя комплексы і г.д.) забясьпечыць сучаснымі ачышчальнымі сістэмамі, перапрафіляваць альбо ліквідаваць.

Неабходна **спыніць драпежніцкую меліярацыю** і значную частку вытворчых магутнасьцяў міністэрства меліярацыі накіраваць на дарожнае будаўніцтва і іншыя мэты.

Усе праекты плануемых вытворчасьцяў, уключаючы ваенныя аб"екты, падлягаюць пазаведамаснай, навукова-экалагічнай экспертызе.

Бяз згоды мясцовай улады і насельніцтва, якая пры неабходнасьці высьвятляецца шляхам рэферэндумаў, ніхто не павінен мець права будаваць прадпрыемствы.

8. БНФ лічыць, што галоўнаю мэтай дэмакратызацыі грамадства зьяўляюцца свабода і суверэннасьць асобы, забесьпячэньне правоў чалавека, **прыярытэт грамадзянскай супольнасьці над дзяржавай.** Толькі пры гэтых умовах можна дасягнуць гуманнай, цывілізаванай дэмакратыі, свабоды і незалежнасьці Беларусі.

Ніякія карпаратыўныя, партыйныя, іншыя ідэалагічныя канцэпцыі не павінны выкарыстоўвацца для падаўленьня правоў і суверэннасьці асобы.

Павінны быць рэальна, безумоўна і бесьперашкодна забясьпечаны свабода перакананьняў і сумленьня, свабода слова, друку, інфармацыі, свабода перамяшчэньня, сходаў, мітынгаў і дэманстрацыяў, свабода выезду ў іншыя краіны і вяртаньня назад, свабода асацыяцыяў. БНФ **за адмену антыдэмакратычных законаў**, прынятых Вярхоўным Саветам БССР на працягу 1988—1989 гадоў.

БНФ выступае **за гуманізацыю жыцьця** грамадства; **за скарачэньне тэрміну вайсковай службы,** узаконеньне права грамадзянаў Беларусі адбываць **вайсковы абавязак на тэрыторыі Рэспублікі,** альбо праходзіць **альтэрнатыўную службу** на будаўніцтве жыльля для чарнобыльскіх перасяленцаў на чыстых тэрыторыях.

БНФ за прыняцьце дэмакратычнай Канстытуцыі Рэспублікі.

9. Асновай сістэмы таталітарызму ў БССР зьяўляецца манаполія КПСС на ўладу і дыктат аднапартыйнай сістэмы кіраўніцтва. БНФ выступае **за скасаваньне шостага артыкула Канстытуцыі БССР аб кіраўнічай ролі КПСС, за свабоду ўтварэньня і дзейнасьці розных партыяў, незалежных прафсаюзаў**, за разьвіцьцё дэмакратычнай сацыяльнай інфраструктуры грамадства. БНФ за прыняцьце закона пра рэферэндум.

10. Людзі павінны **ведаць праўдзівую гісторыю грамадства,** у якім жывуць, і свабодна карыстацца культурнымі здабыткамі свайго народа, мець доступ да скарбаў сусьветнай культуры.

БНФ выступае за прыняцьце закона пра архівы, які абмяжуе тэрміны сакрэтнасьці для архіўных матэрыялаў у адпаведнасьці з міжнароднай практыкай. Неабходна тэрмінова **рассакрэціць архівы КГБ і ЦК КПБ,** перадаць іх матэрыялы для агульнага карыстаньня.

11. Дзесяцігодзьдзі сталінскага генацыду, бюракратычнай дэнацыяналізацыі Беларусі, зьнішчэньня культурнай спадчыны, помнікаў гісторыі і культуры, гуманістычнай маралі, рэлігіі, нацыянальнай гісторыі, мовы прывялі наш народ да заняпаду і культурна-нацыянальнай катастрофы. **Высокародная задача нацыі — выратаваць і адрадзіць родную мову.**

БНФ выступае за канстытуцыйнае ўсталяваньне дзяржаўнасьці беларускай мовы, спадзяецца на падтрымку ўсяго насельніцтва Рэспублікі, незалежна ад нацыянальнасьці, у гэтай маральнай і гуманістычнай справе, якая патрабуе немалога часу, стварэньня ўмоваў, добрай волі і стараньня людзей.

БНФ выступае супроць заканадаўчага замацаваньня за якой-небудзь мовай статуса міжнацыянальнай.

БНФ адстойвае **прынцып нацыянальна-культурнай аўтаноміі** для Беларусі, незалежна ад іх колькасьці і часу пражываньня, падтрымлівае стварэньне нацыянальных школаў, друку, культурных асяродкаў, арганізацыяў. Выступае за юрыдычнае забесьпячэньне гэтых правоў.

Будучыню Беларусі шмат у чым вызначае эфектыўнасьць адукацыі. БНФ выступае за распрацоўку і ўкараненьне нацыянальнай сістэмы адукацыі, за разнастайнасьць яе формаў, **за дэідэалагізацыю і дэмілітарызацыю адукацыі**, за аўтаномію вышэйшых навучальных установаў.

12. БНФ лічыць, што адным з найгалоўнейшых фактараў адраджэньня Бацькаўшчыны зьяўляецца **адраджэньне рэлігійнасьці**, а таксама духоўнасьці культуры.

БНФ адстойвае правы вернікаў усіх канфесіяў нашага краю — хрысьціяняў, іудзеяў, магаметанаў:

выступае за **вызваленьне рэлігіі ад партыйна-дзяржаўнага** дыктату, ад нагляду за вернікам і і сьвятарамі; за вяртаньне рэлігійным аб"яднаньням храмаў і адабранай маёмасьці; аднаўленьне былых і стварэньне новых рэлігійных структураў адпаведна патрэбам вернікаў і наданьне ім юрыдычных правоў грамадскіх арганізацыяў.

БНФ лічыць, што выбары ў Вярхоўны Савет Рэспублікі і ў мясцовыя Саветы стануць паваротнымі для нашай Бацькаўшчыны. Таму ўдзельнічае ў іх пад дэвізам — "ГАЛАСУЮ ЗА БЕЛАРУСЬ!"

Прынята Соймам БНФ
9 сьнежня 1989 года
горад Менск.

ЗЯНОН ПАЗЬНЯК

# НАСУПЕРАК РУХУ – «ВАНДЭЯ»

Набліжаюцца выбары ў Вярхоўны Савет Беларускай ССР і ў мясцовыя Саветы народных дэпутатаў. Гэтыя выбары будуць мець вырашальнае значэньне ў жыцьці нашай Рэспублікі. Паўстае пытаньне: ці зможа народ забясьпечыць сваё поўнае ці хаця б пераважнае прадстаўніцтва ў Саветах? На першы погляд, становішча склалася неспрыяльнае. Кіраўнічая партакратыя ў БССР правяла шэраг антыдэмакратычных законаў. Як і раней, у афіцыёзным друку ідзе татальная дэзінфармацыя насельніцтва аб Беларускім Народным Фронце, аб палітычных працэсах у Беларусі. Асабліва дэзінфармаваныя жыхары сельскай мясцовасьці.

Асаблівасьцю беларускага партапарату, ці як яго ахрысьцілі, ”вандэі“, зьяўляецца адсутнасьць у ім колькі-небудзь прыкметных дэмакратычных плыняў ці нават асобаў. Рэакцыйны фенамен ”вандэі“ мае сваё тлумачэньне. Ён зыходзіць з бюракратычнай ідэалогіі нацыянальнага нігілізму, чым здавён (з 30-х гадоў) характарызуецца гэтак званая ”беларуская“ партбюракратыя. Чалавек, які выракся культуры свайго народу, узьненавідзеў мову, спрыяў этнічнаму паміраньню нацыі, такі чалавек не можа мець дэмакратычнага сьветапогляду, не можа быць вольным.

Нацыянальны нігілізм і рэакцыйная аднароднасьць камуністычнай партакратыі на Беларусі самым некарысным чынам адбілася на становішчы ў Рэспубліцы. Партбюракратыя нясе ўсю адказнасьць за паніжэньне і разбурэньне беларускай нацыянальнай культуры, за русіфікацыю грамадства і зьнішчэньне беларускай мовы, за закрыцьцё беларускіх школаў, за знос помнікаў архітэктуры і зьнішчэньне нацыянальнай спадчыны, рэлігіі, традыцыйнай народнай маралі, за дэгуманізацыю грамадскіх узаемадачыненьняў.

У прыбалтыйскіх рэспубліках і нават у традыцыйна кансерватыўнай Украіне, у кіраўнічым партыйным апараце выяўляюцца пэўныя сілы, якія спрыяюць адраджэньню нацыі, адмаўляюць метады і погляды наменклатурных артадоксаў, рэальна садзейнічаюць галоснасьці і дэмакратызацыі. У выніку закладваюцца асновы для эвалюцыі стваральных кансалідуючых працэсаў. Бо знойдзены сьферы ўзаемадачыненьняў паміж нават супрацьлеглымі палітычнымі сіламі (у дадзеным выпадку паміж кампартыяй і грамадскімі рухамі).

Нічога падобнага не назіраецца ў Беларусі. Сімптаматычна, што, калі 19-га кастрычніка 1988 года было аб“яўлена аб утварэньні Аргкамітэту Беларускага Народнага Фронту, камуністычная наменклатура распачала шалёнае цкаваньне ўсіх дэмакратычных сілаў, асабліва інтэлігенцыі. Нам ня трэба ніякі народны фронт, — чулася з усіх афіцыйных трыбун і розных ”комаў“. Пасыпаліся ”лісты абураных працоўных“ і паднялася хваля арганізаванага ”народнага гневу“. І гэта ў той час, калі новаствораны Аргкамітэт БНФ не сказаў яшчэ ніводнага слова пра свае мэты, пра задачы дзейнасьці. Ня трэба нічога! Такі быў сэнс гэтага наменклатурнага голасу. ”Мартыралог“? — Ня трэба! ”Нам с вами не по пути!“ — сьпяшаліся перакрычаць усіх прыгрэтыя апаратам дочкі двух рэпрэсаваных у 30-я гады кіраўнікоў БССР, ахайваючы ўтварэньне таварыства памяці ахвяраў сталінізму ”Мартыралог Беларусі“. Кульмінацыі гэтая кампанія дасягнула 30 кастрычніка 1988 г., калі супроць мірных людзей, што ў дзень ”Дзядоў“ ішлі на могілкі з кветкамі, ”кінулі“ тры тысячы міліцыянераў, сьпецвойскі, вадамёты, ”чорныя крумкачы“, труцілі народ сьлёзацечным газам, білі дубінкамі, зьневажалі. Такое не забудзецца і не даруецца ніколі.



26 КАСТРЫЧНІКА. МЕНСК. ПЛОШЧА ЛЕНІНА.

Спробы Беларускага Народнага Фронту наладзіць кантакты з дзяржаўнымі органамі і кіраўніцтвам КПБ ні да чаго не прывялі. Камуністы прытрымліваліся сваіх традыцыйных паводзін — гаварыць адно, а рабіць іншае.

Маску з сябе партапарат скінуў увосень гэтага года, калі на пленумах гаркама і ЦК сталі адкрыта гаварыць пра БНФ як пра ”наших политических противников“ і заклікаць камуністаў да барацьбы з Фронтам. На кастрычніцкай сесіі Вярхоўнага Савета БССР адзін нават так сказаў: ”Если нас назовут ”вандеей“, значит мы на правильном пути, товарищи.“

Усё гэта лішні раз сьведчыць ня толькі пра антынароднасьць, адкрытую рэакцыйнасьць і нізкі інтэлектуальны патэнцыял ”вандэі“, пра няўменьне будаваць палітычныя перспектывы, усё гэта пацьвярджае, што кіраўнічае банкруцтва камуністычнага апарату ў Беларусі надзвычай зацягнулася і можа пагражаць народу вялікімі бедамі.

У такіх варунках стабілізацыйную ролю магла б выканаць якраз дэмакратычная апазіцыя ў КПБ — перабудовачныя сілы, сьвежыя думкі і разумныя галовы. Ды вось бяда, такіх сілаў у КП БССР практычна няма. Партыя, асабліва на правінцыі, уяўляе сабой аднародную, кансерватыўную масу, балота, няздольнае па прыродзе сваёй падняцца да асэнсаваньня лёсу беларускай нацыі і вольнай будучыні людзей.

Такое становішча вынікае ня толькі з заганнасьці і нялюдзкасьці камуністычнай ідэалогіі, але і з структуры арганізацыі партыі, пабудаванай на тыпова бюракратычным прынцыпе, калі звыш 80 працэнтаў яе членаў знаходзяцца ў ролі падаткаплацельшчыкаў на ўтрыманьне камуністычнага кіраўніцтва, якое пры жаданьні, можа сьцерці гэтага ”члена“ ў пыл і нідзе ніякай управы ён ня знойдзе, хіба паклаўшы сваё здароўе і дабрабыт, ды й то дарма.

У варунках, што склаліся на Беларусі, ”вандэя“, як і ўсюды, зацікаўленая нагнятаць раздоры, палохаць ”экстрэмістамі“, ”нацыяналізмам“, ”высяленьнем“ рускіх, ”пагромамі“ яўрэяў, ”канфрантацыяй“, БНФ, Талакой, Прыбалтыкай і г.д. Словам, спараджаць у грамадстве пачуцьцё трывогі і няпэўнасьці, запалохваць яго. Чаму гэта робіцца? Тут разьлік на масавую псіхалогію. Грамадства заўсёды імкнецца да стабільнасьці. Калі ж гэтая стабільнасьць парушаецца і узьнікаюць рэзкія і трывожныя дэструктыўныя працэсы, тады ў масах напалоханых, слаба палітызаваных і кепска інфармаваных людзей (асабліва ў абывацеляў) пачуцьцё самазахаваньня скіроўвае іх погляды і надзеі аб паратунку да моцнай цэнтралізаванай улады. Яны пачынаюць прагнуць ”моцнай рукі“, гаспадара, які б навёў парадак.

Цяпер зразумела, на што робіць разьлік ”вандэя“ (зрэшты, цалкам магчыма, што падсьвядома), дэзінфармуючы насельніцтва, стрымліваючы дэмакратызацыю і нагнятаючы ”страхі“. Як сказаў хтосьці з дасьціпных людзей: ”Нацыяналізм — апошні лозунг бюракратыі“.

Акрамя таго, паколькі ў руках ”вандэі“ знаходзіцца ўся ўлада і рэпрэсіўны апарат, яна шукае зачэпкі, каб выкарыстаць яго супроць дэмакратычных працэсаў у Беларусі, пакуль яны ня сталі ўсеагульнымі, так бы мовячы, скампраметаваць і задушыць у зародку, пакуль ёсьць сіла. Менавіта гэтымі прымітыўнымі мэтамі было выклікана нападзеньне ”вандэі“ на людзей 30-га кастрычніка 1988 года.

Цяпер, калі дэмакратычны рух замацаваўся, ”вандэя“ пачала метадычна выкарыстоўваць супроць яго сваю рэпрэсіўную машыну судоў, поўнасьцю падпарадкаваную партапарату. Тут дэманструецца ўжо нават ня тое што прававы нігілізм, а цынічна і адкрыта — фактычная адсутнасьць права, партыйна-апаратная прыналежнасьць суда і пракуратуры.

Аднак, выбарчыя перспектывы ў камуністаў-наменклатуршчыкаў усё ж невялікія, бо ім, каб затрымацца ва ўладзе, увесь час прыходзіцца ашукваць народ, а людзі ўжо пачалі разьбірацца, дзе праўда, а дзе мана. Нельга сказаць, каб камуністы не разумелі, што народ ім ужо ня верыць і перастае баяцца. Нездарма яны робяць цяпер таемныя сацыялагічныя дасьледаваньні на ўсёй Беларусі, каб выпрацаваць тактыку. А тактыка будзе такая. Чакайце адкрытага, ”шчырага“ прызнаньня ”суровай праўды“, ”памылак прошлага“, крытыкі метадаў кіраўніцтва, самакрытыкі, нават пакаяньня; некаторыя будуць ”свае ў дошку“, будуць ”раіцца з народам“, ”как вывести страну“ зь цяжкага стану, будуць ”канкрэтныя“ ”дзелавыя“прапановы як палепшыць жыцьцё, будуць ”канструктыўныя“ ідэі і прагнозы; асабліва шмат ”дзелавых“ прапаноў выкажуць па эканамічных, сацыяльных пытаньнях, не хаваючы ”всей серьёзности положения“. Будуць крывадушна прыносіць у ахвяру нават 6-ы артыкул Канстытуцыі. Словам, людзі павінны пераканацца, што яны, камуністы, — ”адзіная рэальная сіла“, здольная ”кіраваць краінай“ і ”довести перестройку до конца“.

Відаць, таму яны аб“явілі вайну Беларускаму Народнаму Фронту, які думае інакш. Гісторыя, як і грамадства, можа спакойна абыйсьціся без камуністаў, а без народа — не, бо народ гэтую гісторыю стварае. Гісторыя ж паказала, што там, дзе свабодны чалавек, там і свабодны народ — там праца, багацьце, творчасьць, хараство і жыцьцё. Там жа, дзе прайшоў бальшавік — там кроў, сьмерць, курапаты, вынішчэньне культуры, прыроды і зямлі, там брыдота запусьценьня на сьвятым месцы, бязбожжа і рабства і, самае подлае, — мора, акіяны хлусьні. Яны ўсюды аднолькавыя: ці ў СССР, ці на Кубе, у Кампучыі, ці ў Кітаі, у Карэі, ці ў Румыніі, у Польшчы, ці ў Беларусі. І грамадства, народы, павінны бараніцца ад гэтае хваробы ўсімі гуманнымі сродкамі культуры.

Сучаснаму камунізму, што генетычна напрасткі зьвязаны з бальшавізмам, прыдзецца пераасэнсаваць усю сатлелую спадчыну сваіх ідэй, калі ён сапраўды захоча нароўні існаваць у цывілізаваным дэмакратычным грамадстве. Гэтага і блізка ня можа зразумець ”вандэя“. Але пачынаюць разумець людзі.

Тая палітычная сітуацыя, якую стварае ў Беларусі напярэдадні выбараў камуністычная наменклатура, паставіўшы сябе асобна над усім грамадствам і ўзмацніўшы перасьлед дэмакратычных рухаў, прымушае зразумець, што Беларускі Народны Фронт павінен ажыцьцяўляць ня толькі апазіцыю апаратнаму камунізму, але падтрымліваць усе вольныя грамадскія памкненьні на шырокай ”дэмакратычнай аснове, уключаючы камуністаў, духавенства, самадзейныя грамадскія рухі і плыні, дэмакратычную моладзь і студэнцтва, фермераў і калгасьнікаў, дэмакратычных кандыдатаў ад кааператываў і ад рабочых калектываў дзяржаўных прадпрыемстваў, усіх здольных, сумленных, адукаваных, прафесійна падрыхтаваных і палітычна сьвядомых людзей з гуманістычным сьветапоглядам, з пачуцьцём свайго народа і Бацькаўшчыны, гатовых адстойваць суверэнітэт Беларусі, інтарэсы дэмакратыі, культуры, свабоды і сацыяльнай справядлівасьці.

За дзьвесьце гадоў імперскай няволі гісторыя ў каторы раз зноў дае нам шанц да адраджэньня і свабоды. Дае, але нічога ня дорыць. Бо воля патрабуе змаганьня.

## КУДЫ ІДУЦЬ АХВЯРАВАНЬНІ?

Паводле штотыднёвіка ”Ветэран“, на рахунак № 904 у Дзяржбанку СССР (адкрыты пасьля аварыі у Чарнобылі з мэтай збору ахвяраваньняў для ліквідацыі вынікаў катастрофы) па стану на пачатак лістапада мінулага года пералічана 542922662 руб. і 77 кап.

З гэтых сродкаў Беларусь атрымала 20 мільенаў руб., Украіна — 395 мільенаў руб.

65 мільенаў рублеў пералічана Міністэрству атамнай энергетыкі ... для кампенсацыі страт, якія нанесла гэта ведамства ў выніку аварыі, ім жа і данушчанай.

Паведаміла газэта ”Савецкая моладзь“ г. Рыга № 235.

ГРУНВАЛЬД СТУДЗЕНЬ 1990 г № 1

# БЕЛАРУСАМ НА ЎСІМ СЬВЕЦЕ ЖАДАЕМ ШЧАСЬЛІВАГА НОВАГА ГОДУ.

## Жыве Беларусь!



## ЗЬНІЧ

БЕЛАРУСКІ ПРАВАСЛАЎНЫ ПАЭТ

### ПРАСПЕКТ МАШЭРАВА, 25 ЖНІЎНЯ 1987 Г.

(Тунэль ля кнігарні "СЬВЕТАЧ".)

Пад "Машэравым", быццам нанова
партызанская ідзе вайна,
"Беларусы, дзе ваша мова?..." —
патаемна пытае сьцяна.

Ад сьвітанку — ажно да поўдня
тыя словы гарэлі ў вачах.
Беларусы, можа ня позна?...
мо' сьвяты агонь не ачах?...

Як жа ж шкрэблі іх адмыслова!...
Эх, бабулі, — не ваша віна...
Беларусы, дзе ваша мова?...
...зноў чарнее нямая сьцяна.

* *

### СТАЛІЦА

Дзякуй Богу, што Вільню забралі.
Бо — каб н а ш а й сталіцай была —
у магілах бы Храмы ляжалі
на пагосьце бетону і шкла.

Толькі й страціўшы с ь в е т не скарыцца
мой народ. Як шляхотны Кастусь.
Т а м нашчадкаў Скарыны сталіца,
дзе д у х о ў н а
Жыве Беларусь!

# ЗВАРОТ

## ДА БЕЛАРУСАЎ, ШТО ЖЫВУЦЬ У ЭСТОНІІ

Паважаныя суайчыньнікі! Наша дарагая Бацькаўшчына Беларусь у няшчасьці. Тры гады кіраўніцтва рэспублікі і Масква хавалі ад народа вынікі Чарнобыльскай аварыі на Беларусі. Цяпер, калі пачалі хварэць нашыя людзі, нашыя дзеці, калі з разьвіцьцём грамадскага руху рэспубліканскае і саюзнае кіраўніцтва вымушаны былі адкрываць сакрэт за сакрэтам, таямніцу за таямніцай, высьветлілася, што Чарнобыльская бяда абарочваецца для нас нацыянальнай катастрофай, заўчаснымі сьмерцямі, непаўнацэннымі дзецьмі, хваробамі народа, трывожнай будучыняй. Наша мілая зямля — радыёактыўная. На ёй безьліч прыгожых мясьцін, але людзям у іх ужо нельга жыць.

Другое, што высьветлілася цяпер. Нам, беларусам, не дапамогуць, бо не хочуць пасапраўднаму дапамагаць — ні саюзныя акадэміі, ні медыцынскія ведамствы, ні кіраўніцтва. Надзея на нас саміх. Нам не хочуць нават кампенсаваць належныя нам мільярды рублёў на высяленьне з абжытых мясьцін, за гора, за няшчасьце, у якім мы не вінаватыя. Нам не дапаможа ніякое ведамства з-за мяжы, бо высьветлілася, што і савецкая і і міжнародная так званая атамная грамадскасьць глядзіць на нашу Зямлю як на ўнікальны палігон для радыяцыйных выпрабаваньняў над людзьмі. Таму, напэўна, і хавалася праўда ад сьвету.

Чаму так сталася? Чаму на трагедыю культурнай Арменіі адгукнуўся ўвесь сьвет, а пра трагедыю для пакаленьняў у Беларусі тры гады ня ведаў ніхто? А таму, што за дзесяцігодзьдзі таталітарнай сістэмы, за дзесяцігодзьдзі вынішчэньня нашай культуры і мовы, нашае гісторыі і нацыянальнае годнасьці мы сталі забывацца, што мы нацыя, што мы народ, мы перасталі шанаваць сябе. Губляючы нацыянальныя здабыткі, мы страчвалі нацыянальную сьвядомасьць, а таму страцілі аснову для народнай кансалідацыі перад катастрофай, перад несправядлівасьцю, якая датычыць усіх нас. Бюракратыі зручна ператвараць народы ў натоўпы. Лягчэй кіраваць.

Перад абліччам народнай бяды тыя, хто жывуць на Беларусі, і тыя, хто за яе межамі, — успомнім жа ў гэты трагічны час пра вялікі, жыцьцядайны, Боскі сэнс для ўсіх нас нашае роднае беларускае мовы, нашай нацыянальнай гісторыі і спадчыны, нашых народных традыцый веры і культуры, этыкі і маралі, зразумеем жа, зьвернемся да іх і палюбім. Гэта зробіць нас духоўна здаровым народам, здольным глядзець у будучыню. Гэта адкрые ў нас дар разумець і шанаваць іншыя народы, калі жыць сярод іх нам выпадзе лёс. І не зьдзівімся, калі палюбіўшы Беларусь, мы полюбім Эстонію. У нас расплюшчацца вочы і ні рука, ні язык, не накінецца на сьвятое. Мы паставім у думках сябе на іх месца і зразумеем, што і справядліваьць, і права, і праўда за імі. Мы падзівімся іх мужнасьці і культуры, творчасьці і мэтанакіраванасьці. І захочам дапамагчы ім, бо, калі такі малалікі народ можа быць такім вялікім, то хіба ж не можам палепшыцца й мы ў сваей Беларусі!

Самае страшнае, што выгадавала адміністрацыйна-бюракратычная сістэма ў нашым грамадстве, гэта нацыянальны нігілізм — непавагу да свайго народа, мовы і нацыянальных каштоўнасьцяў. І такі ўжо закон, што той, хто не хоча шанаваць сваё, не шануе й чужое. Менавіта на такой псіхалогіі заснаваныя антыэстонскія настроі ў рэспубліцы, дзе Вы жывяцё. Будзем жа вышэйшыя за бытавыя крыўды, памятаючы, што ў эстонскага народа ў Эстоніі, як і ў нашага на Беларусі — свой лёс. І ніхто гэты лёс не вырашыць за іх у Эстоніі, а за нас — у Беларусі. Нам будзе вельмі балюча (і не толькі нам, але і нашай гісторыі), калі беларусы ў Эстоніі пакіруюцца сабой неразважліва, паддадуцца на авантуры, на антыэстонскую агітацыю.

Жывучы зь іншым народам, на яго зямлі, нельга не ведаць яго мовы, не цікавіцца яго жыцьцём, нельга не дапамагаць яму ў цяжкі час. Можа праз спагаду і інтэрас да эстонца-суседа вернуцца да нас сьветлыя думкі і вобразы нашай дарагой і рядыяактыўнай цяпер Зямлі. Дык падумаем жа пра яе. ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ! ELAGU EESTI!

Кіраўніцтва Беларускага
Народнага Фронту "Адраджэньне",
г. Менск.

ГРУНВАЛЬД

ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ БЕЛАРУСКАГА КУЛЬТУРНАГА ТАВАРЫСТВА "ГРУНВАЛЬД".

НАШ АДРАС: 200090 ЭСТОНІЯ. ТАЛІН. Аб./Скр. 3290.

РЭДАКТАР — Валеры Чыжык

Выходзіць 2 разы на месяц.

Друкарня "Октообер". Зак. 140. Наклад 25 тыс.

Меркаваньне аўтараў публікаваных матэрыялаў не абавязкова супадае зь меркаваньнем рэдакцыі.

Кошт у Эстоніі — 30 кап.
За межамі Эстоніі — 50 кап.

Библиотека Международного Мемориала

# ГРУНВАЛЬД

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!

САКАВІК 1990 г. НАВІНЫ БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭНЬНЯ № 2

## ЗЬМЕСТ

# ДА 72-х УГОДКАЎ БНР

Угодкі Акту 25-га сакавіка 1918 сталіся беларускім нацыянальным сьвятам, якое цяпер урачыста сьвяткуецца ўсім беларускім грамадзтвам у Вольным Сьвеце. Незалежнасьць Беларусі была праўна прызнаная гэткімі гаспадарствамі: Украінай, Чэхаславаччынай, Аўстрыяй, Фінляндыяй, Польшчай, Турэччынай, Летувой, Латвіяй, Эстоніяй, Арменіяй і Грузіяй. Бальшыня краінаў сьвету прызнала фактычную незалежнасьць Беларусі.

СТАР. 2—3

## АЛЕСЬ БЯЛЯЦКІ
### ДВА АРТЫКУЛЫ

СТАР. 6

### ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА

СТАР. 4



# ХРЫСТОС УВАСКРОС!



Жыровічы. Царква 1769 г.

# СА СЬВЯТАМ!

СТАР. 8

Библиотека Международного Мемориала

# ДА 72-х УГОДКАЎ БНР

## 25 САКАВІКА — ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ БЕЛАРУСІ

Беларускім Культурным таварыствам "Грунвальд" былі адзначаны 72-я ўгодкі Беларускае Народнае Рэспублікі (БНР).

На ўрачысты сход, які адбыўся з дазволу Эстонскіх уладаў 25 сакавіка 1990 г. а 12 гадзіне дня ў Таліне, на выспе Хар'ю, сабраліся прадстаўнікі таварыства "Грунвальд", госьці з Украінскага таварыства ды значная колькасьць сьвядомых беларусаў з Таліна і яго наваколья.

Актывісты таварыства "Грунвальд" Лявон Валуй і Сяржук Сотчанка расказалі прысутным аб умовах, у якіх адбылося абвешчаньне БНР і аб уздыме Беларускага Адраджэнскага руху пасьля Кастрычніцкага перавароту ў Расіі ў 1917 годзе.

Былі зачытаны "Другая Ўстаўная Грамата" Рады Кангрэсу і "Трэйцяя Ўстаўная Грамата" Рады БНР, якая абвесьціла Беларускую Народную Рэспубліку незалежнай дзяржавай.

Усё наваколье было ўпрыгожана бел-чырвона-белымі сьцягамі, лunалі жоўта-блакітны Ўкраінскі і сіня-чорна-белы Эстонскі нацыянальныя сьцягі.

Былі выстаўлены транспаранты ў падтрымку незалежнасьці Эстоніі, Беларусі і Літвы.

Тацьцяна Кучынская чытала беларускія вершы, разам сьпявалі беларускія песьні.

Зь вялікім болем гаварылі прысутныя аб становішчы ў Беларусі, аб тым, як ад Чарнобыльскага генацыду хварэюць і паміраюць людзі, аб тым, да якой роспачы і адчаю прывеў беларускі народ гэтак званы "Развитой социализм".

Гаварылі аб тым, як марудна ідзе нацыянальнае адраджэньне на Беларусі і аб пасіўнасьці беларускай інтэлігенцыі, значную частку якой ўдалося ўцягнуць бюракратыі ў "барацьбу" з сусьветным жыда масонствам, каб ня даць ей магчымасьці накіраваць свае сілы на стварэньне нацыянальнага Адраджэнскага руху на Беларусі.

Як выказваліся многія, трэба меньш займацца цкаваньнем "Вандэі" а самааддана і самаахвярна працаваць на адраджэньне нацыянальнае сьвядомасьці ў Беларусаў.

Без нацыянальнае самасьвядомасьці няма будучыні ў нацыі а без нацыянальнае кансалідацыі ніколі ня будзе і незалежнасьці.

ЖЫВУЦЬ 72-Я ЎГОДКІ БНР!
ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!

Рэдакцыя




Вчера около четырех часов дня внимание прохожих проходивших по Нарвскому шоссе, привлекли двое молодых людей с плакатами в руках. Это были члены белорусского общества «Грунвальд», действующего при Фонде культуры Эстонии. На плакатах было написано приглашение белорусам собраться 25 марта в 12 часов на горке Харью. В этот день в городах Белоруссии и Прибалтики состоится акция солидарности, посвященная годовщине независимой Белорусской Народной Республики, провозглашенной 25 марта 1918 года. БНР просуществовала меньше года. Но национальная история живет в народной памяти. Место и время для демонстрации плакатов было выбрано не случайно — конец рабочей смены и как раз напротив НПО РЭТ и «Эстикабеля», на которых работает много белорусов.

Фото Мати Хийса.

Вечерний Таллинн 23.03.90 г.






Здымкі з мітынга. Талін. 25 сакавіка 1990 г.

**Жыве Беларусь!**

GRÜNWALD

КРАСАВІК 1991, № 1

# ГРУНВАЛЬД

## НЕЗАЛЕЖНЫ БЕЛАРУСКІ ЧАСАПІС




СЛУЧЧЫНА.
Дзяўчынкі ў традыцыйным адзенні. Пачатак XX ст.

З кнігі "Беларускае народнае адзенне". Міхась Раманюк. "Беларусь", Мінск 1981 г.

Библиотека Международного Мемориала

# ГРУНВАЛЬД

*НЕЗАЛЕЖНЫ БЕЛАРУСКІ ЧАСАПІС*

**КРАСАВІК 1991, № 1**

## ЗЬМЕСТ

4 **ЯЎХІМ КІПЕЛЬ.** *СМАЛЕНСК У 1919 ГОДЗЕ*

6 **І. КАСЯК.** *ШЛЯХАМ ЗМАГАНЬНЯ*

9 **ЮРКА ВІЦЬБІЧ.** *«ХАМУТОЎ НЯ ЗНАЮЦЬ КОНІ ПРОДКАЎ»*

11 **ЯЗЭП БАРЭЙКА.** *ФРАНЬЦІШАК БАГУШЭВІЧ*

13 *ЛІТВА*

16 *ІКОНА ВІЛЕНСКАЕ ВОСТРАБРАМСКАЕ БОЖАЕ МАЦІ*

18 **ЮРКА ВІЦЬБІЧ.** *ТАМ, ДЗЕ СУМУЕ ЧОРНАЯ ДАМА*

19 **Г. ПІХУРА.** *КНЯГІНЯ МАГДАЛЕНА РАДЗІВІЛ*

21 **АЎГЕН КАЛУБОВІЧ.** *НАШЫ ПАПЯРЭДНІКІ*

• **ВЕРШЫ БЕЛАРУСКІХ ПАЭТАЎ НА ЭМІГРАЦЫІ**



Библиотека Международного Мемориала

*4 октября 2016 года Минюст РФ внес Международный Мемориал в реестр «некоммерческих организаций, выполняющих функцию иностранного агента». Мы обжалуем это решение в суде.*

Библиотека Международного Мемориала